# ІНСТЫТУЦЫЯНАЛЬНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЎВАХОДЖАННЯ БЕЛАРУСІ Ў СУСВЕТНЫ РЫНАК ТУРЫСТЫЧНЫХ ПАСЛУГ

**У.А. Ганскі**
*Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, г. Наваполацк, Беларусь*

Генэзіс эканамічных інстытутаў, іх развіццё, магчымыя дысфункцыі і эфектыўнасць з’яўляюцца цэнтральнымі пытаннямі для сучаснай неэінстытуцыянальнай тэорыі бо эканамічная рэчаіснасць уяўляе сабой працэс бесперапынных змен. Выкарыстанне новых тэхналогій, інавацый спрыяе змене эфектыўнасці традыцыйных рэсурсаў, дазваляе пашыраць іх спектр, залучаючы ў вытворчасць тыя з’явы і аб’екты жывой і нежывой прыроды, выкарыстанне якіх у гаспадарчай дзейнасці, якія раней не ўяўлялася магчымым. Узровень глабалізацыі і яе зменлівы характар, які выяўляецца ва ўзмацненні глабальнай канкурэнцыі за ўсе рэсурсы развіцця, а не толькі за сыравінныя і энергетычныя, у ахопе ёю новых сфер, уключаючы сістэму нацыянальнага кіравання, падтрымкі інавацый, развіцця чалавечага капіталу, у павышэнні глабалізаванасці большасці рынкаў, істотным чынам мадыфікуе развіццё нацыянальных эканомік. Нават пералічаныя змены ілюструюць зрухі ва ўмовах прыняцця эканамічных рашэнняў і ў правілах гаспадарання, паколькі прадугледжваюць змены ў сістэмах фармальных інстытутаў.

Пад інстытутам прапануецца разумець сукупнасць нефармальных і фармальных правілаў. Інстытуты не толькі забяспечваюць механізмы ўзаемадзеяння паміж людзьмі, але і робяць паводзіны эканамічных агентаў больш зразумелым і прагназуемым. Інстытуцыяналізацыя рынку турыстычных паслуг азначае структураванне яго эканамічнай сістэмы шляхам упарадкавання паводзін людзей на аснове фарміравання аб’ектыўна абумоўленых спосабаў каардынацыі і ўзгаднення іх дзейнасці. Правілы, працэдуры, санкцыі і арганізацыйныя формы, як сутнасць эканамічнага інстытута, канстытуіраваны ў інстытуцыйныя формы, аналіз якіх дазволіў вылучыць чатыры групы інстытутаў, якія забяспечваюць функцыянаванне рынку турыстычных паслуг: інстытуты турыстычнай дзейнасці і турыстычнай інфраструктуры; інстытуты аб’ектаў турыстычнага паказу; інстытуты развіцця рынку турыстычных паслуг і інстытуты рэгулявання рынку турыстычных паслуг. Сукупнасць прыведзеных інстытутаў (недасканалых па ўзроўню свайго развіцця) утварае інстытуцыйную сераду рынку турыстычных паслуг. Сучаснае дынамічнае развіццё рынку турыстычных паслуг прадугледжвае фарміраванне новага інстытуцыйнага асяроддзя, у межах якога паводзіны эканамічных суб’ектаў стане больш прадказальным і скаардынаваным.

Паспяховае ўваходжанне Беларусі ў сусветны рынак турыстычных паслуг немагчыма без адпаведнага інстытуцыянальнага забеспячэння гэтага працэсу. З мэтай аптымізацыі інстытуцыйнага асяроддзя рынку турыстычных паслуг у

Рэспубліцы Беларусь і яе трансфармацыі ў прастору высокай турыстычнай прывабнасці мэтазгодным ўяўляецца правядзенне шэрагу наступных мерапрыемстваў па асноўных групах інстытутаў.

1. Інстытуты турыстычнай дзейнасці і турыстычнай інфраструктуры:

а) інстытут турыстычнай дзейнасці – ўнясенне зменаў у Палажэнне аб ліцэнзаванні асобных відаў дзейнасці, зацверджанае Указам Прэзідэнта 01.09.2010 г. № 450 у частцы вяртання да практыкі абавязковага ліцэнзавання турыстычнай дзейнасці і прымянення кваліфікацыйных патрабаванняў да кіраўнікоў гаспадарчых суб'ектаў і кіраўнікоў іх структурных падраздзяленняў пры суісканне імі ліцэнзіі на права ажыццяўлення тураператарскай і турагенцскай дзейнасцей; ўнясенне змен у Грамадзянскі кодэкс Рэспублікі Беларусь у частцы вызначэння мер адказнасці асобы, якая ажыццяўляе дзейнасць экскурсавода або гіда-перакладчыка без праходжання прафесійнай атэстацыі ў нацыянальнай турыстычнай арганізацыі;

б) інстытут курортнай дзейнасці – адмена патрабавання абавязковай наяўнасці санаторна-курортнай карты (СКК) або формы 1 мед/у-10 «Выпіска з медыцынскіх дакументаў» у замежных грамадзян, якія набываюць пуцёўкі ў санаторна-курортныя ўстановы Рэспублікі Беларусь і пашырэнне практыкі вызначэння санаторна-курортнага лячэння непасрэдна ў санаторна-курортных і аздараўленчых установах;

в) інстытут гасцінічна-рэстараннай дзейнасці – унясенне зменаў у Правілы ажыццяўлення рознічнага гандлю асобнымі відамі тавараў і грамадскага харчавання, зацверджаныя Пастановай Савета міністраў Рэспублікі Беларусь 07.04.2004 г. № 384 ў частцы замены палажэння аб пазначэнні кошту тавараў (работ/паслуг) выключна ў беларускіх рублях на палажэнне аб магчымым празначэнні кошту тавараў (работ/паслуг) як у беларускіх рублях, так і ў замежнай валюце ў інфарматыўных мэтах – пры ўмове аплаты тавараў (работ/паслуг) у беларускіх рублях.

2. Інстытуты аб'ектаў турыстычнага паказу:

а) інстытут выкарыстання прыродных рэсурсаў – падрыхтоўка Міністэрствам аховы здароўя Рэспублікі Беларусь нарматыўна-прававых актаў, якія б рэгулявалі парадак вызначэння лячэбных уласцівасцяў прыродных рэсурсаў (мінеральных вод, лячэбных гразяў, клімату і інш.) у турыстычнай дзейнасці; а таксама распрацоўка Саветам міністраў Рэспублікі Беларусь і зацвярджэнне ва ўстаноўленым парадку зон санітарнай аховы лячэбна-аздараўленчых мясцовасцяў і курортаў;

б) інстытут выкарыстання культурна-гістарычных рэсурсаў – унясенне змяненняў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны» ад 09.01.2006 г. ў частцы аптымізацыі працэдур арэнды і прыватызацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, распрацоўка механізмаў вызначэння кошту аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, пашырэнне абгрунтаваных нарматываў платы за выкарыстанне аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны ў

PolotskSU

турыстычных мэтах, забеспячэння спагнання платы і мэтавага выкарыстання сабраных сродкаў на павышэнне каштоўнасці дадзеных турыстычных рэсурсаў.

3. Інстытуты развіцця рынку турыстычных паслуг:

а) інстытут развіцця перспектыўных турыстычных тэрыторый, турыстычнай інфраструктуры і турыстычных праектаў – унясенне зменаў у дзеючае заканадаўства, якія прадугледжвалі б стварэнне турысцка-рэкрэацыйных асаблівых эканамічных зон, з усталяваннем на іх тэрыторыі ільготнага рэжыму ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці ў мэтах прыцягнення інвестыцый у названыя сферы, з выкарыстаннем дзяржаўна-прыватнага партнерства ў стварэнні інфраструктуры турысцка-рэкрэацыйных асаблівых эканамічных зон, прадастаўленнем ільгот па падатку на прыбытак, па падатку на маёмасць і зямельнага падатку падатковым заканадаўствам рэзідэнтам турысцка-рэкрэацыйных асаблівых эканамічных зон;

б) інстытут прасоўвання турыстычных паслуг на нацыянальным і міжнародных рынках – стварэнне новых і змяненне механізмаў функцыянавання існуючых замежных прадстаўніцтваў нацыянальнай турыстычнай арганізацыі на найбольш патэнцыйных і суседніх рынках.

4. Інстытуты рэгулявання рынку турыстычных паслуг:

а) інстытут міжнароднага рэгулявання рынку турыстычных паслуг – ратыфікацыя Рэспублікай Беларусь Канвенцыі аб мытных ільготах для турыстаў і Дадатковага пратакола да яе, што дазволіць гарманізаваць турыстычныя працэдуры, спрасціць працэдуры мытнага афармлення турыстаў на мяжы, палегчыць увоз на тэрыторыі краін-удзельніц турыстычных рэкламных дакументаў і матэрыялаў і інш;

б) інстытут дзяржаўнага рэгулявання рынку турыстычных паслуг – правядзенне рэарганізацыі сістэмы цэнтральных органаў дзяржаўнага кіравання турызмам шляхам зліцця Міністэрства спорту і турызму і Міністэрства культуры ў адзін шматфункцыянальны орган – Міністэрства культуры, з утварэннем у рамках дадзенага міністэрства трох базавых ведамстваў: Дэпартамэнта турызму, Дэпартамента фізічнай культуры і спорта і Дэпартамента мастацтва і творчасці з наступнай праекцыяй дадзенай структуры на рэгіянальны і лакальны ўзровень;

в) інстытут турыстычнай міграцыі – ўнясенне зменаў у Закон Рэспублікі Беларусь «Аб прававым становішчы замежных грамадзян і асоб без грамадзянства ў Рэспубліцы Беларусь» ад 04.01.2010 г. у частцы нарматыўнага замацавання парадку выдачы замежным грамадзянам беларускіх аднакратных турыстычных віз на тэрмін не больш за 30 дзён у чыгуначных і аўтадарожных пунктах пропуску праз дзяржаўную мяжу Рэспублікі Беларусь, а таксама ў пункце пропуску праз дзяржаўную мяжу ў Нацыянальным аэрапорце «Мінск» – пры наяўнасці ў замежнага грамадзяніна дакументальнага пацверджання мэты паездкі, выдадзенага прадпрыемствамі-рэзідэнтамі Рэспублікі Беларусь, уключанымі ў Дзяржаўны рэестр суб’ектаў турыстычнай дзейнасці; уніфікацыя ў рамках Мытнага саюза Беларусі, Расіі і Казахстана пашпартна-візавага заканадаўства і ўвядзенне адзінай візы Мытнага саюза, аналагічна шэнгенскай,

PolotskSU

альбо прадастаўленне права грамадзянам-нерэзідэнтам Мытнага саюза знаходжання на тэрыторыі ўсіх краін-удзельніц Мытнага саюза на аснове візы, выдадзенай адной з краін-удзельніц Мытнага саюза;

г) інстытут статыстычнага турыстычнага ўліку – пераход ад практыкі вызначэння структуры і аб'ёмаў уязных турыстычных патокаў у Рэспубліку Беларусь шляхам аналізу форм дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці суб'ектаў турыстычнай дзейнасці да практыкі вызначэння структуры і аб'ёмаў знешніх турыстычных патокаў на аснове комплексу дадзеных: 1) консульскіх падраздзяленняў замежных дыпламатычных прадстаўніцтваў Рэспублікі Беларусь – адносна турыстаў з краін з візавым рэжымам з Рэспублікай Беларусь; 2) Дзяржаўнага памежнага камітэта – у дачыненні да турыстаў з краін з бязвізавым рэжымам з Рэспублікай Беларусь; 3) формаў дзяржаўнай статыстычнай справаздачнасці гаспадарчых суб'ектаў, якія аказваюць паслугі па часовым размяшчэнні турыстаў, а таксама суб'ектаў аграэкатурызму – у дачыненні да турыстаў з краінаў, на мяжы з якімі беларускім бокам памежны, мытны і іншыя віды кантролю не ажыццяўляюцца.

Такім чынам, рэалізацыя прапанаванага комплексу мерапрыемстваў па аптымізацыі інстытуцыянальнага асяроддзя рынку турыстычных паслуг у Рэспубліцы Беларусь створыць спрыяльныя перадумовы для канцэнтрацыі наяўных арганізацыйных, фінансавых, інтэлектуальных, матэрыяльна-тэхнічных і іншых рэсурсаў для вырашэння найбольш вострых праблем рынку турыстычных паслуг, развіцця каштоўных прыродных тэрыторый і аб'ектаў культурнай спадчыны, забеспячэння абароны эканамічных інтарэсаў дзяржавы ад рэальных і патэнцыйных пагроз на нацыянальным і міжнародных рынках турыстычных паслуг. Ключавымі момантамі трансфармацыі інстытутаў турыстычнай дзейнасці і турыстычнай інфраструктуры павінна стаць, з аднаго боку, узмацненне адказнасці суб'ектаў рынку турыстычных паслуг, закліканай павысіць якасць аказваемых турыстычных паслуг і абароненасць спажыўцоў ад нядобрасумленных вытворцаў турыстычных паслуг; а з іншага боку, адмова ад залішняй рэгламентацыі працэсу спажывання турыстычных паслуг, што заклікана палегчыць працэс прасоўвання і рэалізацыі айчынных турыстычных паслуг на знешніх рынку. Змены, якія тычацца інстытутаў аб'ектаў турыстычнага паказу, пакліканы павысіць паўнату і выніковасць іх выкарыстання ў працэсе вытворчасці турыстычнага прадукту. Інстытуты развіцця рынку турыстычных паслуг пры рэалізацыі прапанаваных мерапрыемстваў будуць спрыяць фарміраванню сучаснай турыстычнай інфраструктуры, павелічэнню колькасці суб'ектаў рынку турыстычных паслуг і ўзмацненню канкурэнцыі, што пазітыўна адаб'ецца на якасці і кошце турыстычных паслуг, і тым самым павысіць іх канкурэнтаздольнасць. Прапанаваная трансфармацыя інстытутаў рэгулявання рынку турыстычных паслуг будзе спрыяць спрашчэнню доступу да беларускіх турыстычных паслуг замежных спажыўцоў, павышэнню спрашчэнню ўліку і аналізу міжнародных турыстычных патокаў.